ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 144 (526) Серада, 28 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Рэлігія---тормаз соцыялістычнага будаўніцтва.

ПРАЦОЎНАЯ МОЛАДЗЬ—ПЕРШЫЯ ШЭРАГІ БАРАЦЬБІТОЎ З ПАПОЎСКА-СЭКТАНЦКАЙ АГІТАЦЫЯЙ.

Толькі клясавая барацьба рабочых мас, усебакова ўцягваючы шырокія пласты працоўнага сялянства ўсьвядомую і рэволюцыйную грамадзкую працу, зможа на справе вызваліць прыгнечаныя масы ад уціску рэлігіі.

300.000.000 рублёў за дурман народу.

Дні сьвята «нараджэньня бога» зьяўляюцца пэрыядам узмацнёнай дзейнасьці рэлігійных організацый. Звычайна папы старанна рыхтуюць веруючую масу да гэтага сьвята: цьвердзяць аб неабходнасьці захаваньня «піліпаўскага» посту, ходзяць з малітвамі па хатах веруючых.

Наведвальнасьць цэркваў у дні калядаў, бязумоўна, павялічваецца. Нават многія з тых, хто звычайна ня ходзіць у царкву з прычыны занятасьці ці «пасыўнасьці» да рэлігіі—на каляды загляне ў «храм божы».

Сьледам за калядамі ідзе сьвята нова-га году, моцнае сваімі рэлігійна-бытавымі традыцыямі. Потым ідзе сьвята «вадохрышчы», якое і замыкае сабою сьвяточны двухтыднёвік.

Уплыву «каляднага быту» паддаюцца нават няверуючыя, дзякуючы таму, што ў іх сем'ях ёсьць набажныя, ці з прычыны ўкаранёнай прывычкі. Нават у вясковых сем'ях, якія поўнасьцю складаюцца з няверуючых, стол у дні каляд такі-ж, як і ў веруючых: і закуска добрая, і выпіўка багатая.

Было-б памылкай думаць, што выконваньне рэлігійнай каляднай абраднасьці носіць сьвядомы характар, што большасьць удзельнікаў у іх далёка ад бязбожжа. Уздым рэлігійнай хвалі ў часе „вялікіх“ сьвятаў узьнікае поўнасьцю за кошт уплыву забабонаў старога быту.

У нас і сярод моладзі і сярод дарослых яшчэ патрэбнай глыбокай, вытрыманай, прадуманай і абгрунтаванай на доказах навуковых дасьледцаў работы не вялося. Часта нашы камсамольскія і партыйныя антырэлігійныя працаўнікі разьюшаным голасам, у клюбе, ці хаце-чытальні, заклікаюць насельніцтва ня верыць у бога, бо «рэлігія—дурман для народу», а самі дома з саладкай ухмылкай на вуснах паглядаюць на калядныя прыгатаваньні замест таго, каб гэтаму старому сьмярдзячаму парадку процістаставіць новы, бадзёры, комсамольскі.

Такія моманты паслабляюць нашу антырэлігійную работу. А гэта, у сваю чаргу, дае вынікі зусім дрэнныя для справы разьвіцьця і выхаваньня соцыялістычнай грамады.

Зараз у СССР налічваецца яшчэ 40 тысяч «божых храмаў», каля якіх кормяцца да 500 тысяч служак культу. І калі кожны з іх разам з сям'ёю расходуе толькі 50 рублёў у месяц (ці 600 рублёў у год), дык і тады атрымоўваецца не маленькая лічба: 300 мільёнаў рублёў у год плаціць народ за сваё адурманьваньне.

А 300.000.000 гэта—кошт пабудаваньня двух такіх волатаў, як Днепрабуд, ці некалькіх Асінабудаў; гэта 60.000 трактараў для вёскі і гэта — 30-40 першаклясных фабрык; гэта — сотні школ, больніц, клюбаў.

За апошнія гады па жаданьню самых веруючых было зачынена больш тысячы цэркваў, 29 мячэцяў, 27 «стараверскіх» цэркваў і г. д. Але «300 мільёнаў рублёў» паказвае, што рэлігія яшчэ моцна сядзіць у быце народу, што з гэтымі «хатнімі забабонамі» трэба весьці рашучую барацьбу.

Адбіваючы інтарэсы нэпманскіх і кулацкіх праслоек, рэлігія ў нашай краіне зьяўляецца тормазам на ўсіх шляхох соцыялістычнага будаўніцтва.

Рэлігія зьяўляецца тормазам ва ўсіх соцыялістычных пачынаньнях—пераабсталяваньні нашай прамысловасьці на вышэйшай тэхнічнай і вытворчай базе, разьвіцьці коопэрацыі і колектыўных форм гаспадараньня ў вёсцы. У процівагу ім сэкты будуюць сваю «коопэрацыю», свае арцелі і «комуны», пад маркай якіх хаваюцца організацыі кулакоў.

Рэлігія—перашкода культурнаму ўздыму працоўных мас. Яна перашкаджае будаўніцтву новага соцыялістычнага быту, усямерна абараняючы і замацоўваючы формы старога жыцьця, выгадныя нэпману і кулаку. Рэлігія ў некаторай ступені перашкаджае разьвіцьцю комсамольскага і піонэрскага руху.

Вось таму мы і заклікаем усю працоўную моладзь у шэрагі бязбожнікаў, у шэрагі барацьбітоў з рэлігійным дурманам, вось таму мы і гаворым нашым антырэлігійнікам—«бі веру ня сказам, а паказам».

Мімалётнай кампаніяй бога не разаблачыш. Патрэбна доўгая і упартая работа. Пачаткам ёй павінны паслужыць сёлетнія «комсамольскія каляды».

Як мне бог „дапамог“.

Допіс 60-гадовага селяніна з вёскі Шунайкі, Полацкай акругі—Васіля Бурдзіка.

Неяк гэтымі днямі быў я ў чытальні і папала мне пад рукі газэта комсамольцаў „Чырвоная Зьмена“. Мяне зацікавіў той матар'ял, які назван вялікімі літарамі так—„Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыялізм“.

Чытаю я, па праўдзе сказаць, не ахці як добра, але усё-ж прачытаць магу. Дык я і зачытаўся гэтаю газэткаю. Чытаў, чытаў, вочы забалелі, а скончыць ня ўсьпеў. Папрасіў я газэтку на адзін дзянёк дамоў і, дзякуй яму, загадчык мне не адмовіў.

У нядзелю амаль увесь дзень патраціў—чытаў усё. З усім, браткі згодзен. **Што няма бога—дык я, стары селянін, магу тысячу разоў пабажыцца за гэта.**

Але я хацеў напісаць нашаму комсамолу, як мне „бог дапамог“.

Помню, як цяпер, справа была ў піліпаўку, на апошнім тыдні прад калядамі. Хадзіла пошасьць ціф. Захварэла жонка і двое старэйшых дзяцей. Усе парадкі ў хаце пайшлі на смарку—вядома, гаспадыня зьлягла. Падаў я сюды і туды, біўся, як рыба аб лёд — рады мала. А тут яшчэ беднасьць тая. Пачалі правіцца старэйшыя—меншыя пахварэлі, ды так зьляглі, што страх і падумаць... Памерла меншая дачка, як сёньня, а праз два дні і хлопчык Мікіта сканаў.

Прывезьлі бацюшку; прашу, каб пахаваў без грошай, улетку адпрацую,—дык дзе там, і гаварыць не даецца. Потым я падхупся даць яму хурманку да мястэчка. Самому нешта не здаровілася, дык я выправіў Данілку, вечная памяць яму, свайго старэйшага хлопчыка. Беднае дзіця толькі што з пасьцелі ўстала, высахла, як ніціна.

Назад Данілка варочаўся ноччу. Усхадзілася мяцеліца. Не даяжджаючы вёскі, каля лесу, напалі на каня ваўкі. Спужалася дзіця, кінула скаціну і ледзь жыва дамоў прыбегла. Панулі дапялі некальні нас мужчын да лесу. Конь ужо і ахаладзеў... Праз два дні памёр і Данілка.

За адзін тыдзень ня стала траіх дзяцей і каня!

Раззлаваўся я тады на бога (а прызнацца раней учашчаў у царкву), плюнуў на ўсе грахі, і стаў бязбожнікам. Цяпер дык і даволен: неяк і жыць, як стаў бязбожнікам, палепшыла.

БУРЗІК ВАСІЛЬ.

Вайна і рэлігія.

«Вайна і рэлігія»—што між імі агульнага»,—скажуць веруючыя. «Рэлігія вучыць «сьмірэньню», а на вайне якое-ж можа быць сьмірэньне»,—думаюць яны. Паміж іншым, ня цяжка ўпэўніцца, што рэлігія і рэлігійныя організацыі заўсёды служылі мэтам вайны, заўсёды прапаведвалі самыя чалавека-ненавісныя погляды і заўсёды благаслаўлялі самыя крывавыя бойкі.

Усім памятна вайна 1904 году, якая ўнесла 10 мільёнаў забітых і пакінула пасьля сябе вялізарную колькасьць інвалідаў

Але ці знашлася тады хоць адна рэлігійная організацыя, якая-б протэставала супроць гэтай бойкі, наладжанай капіталістымі?

„Паслугі“ Лойд-Джоржа.

Нават сэктанцкія організацыі ўдзельнічалі ў ёй, а вядомы ангельскі баптысты Лойд-Джорж быў міністрам снабжэньня і рыхтаваў «во славу божыю» хімічныя снарады з атрутнымі газамі. Папы ўсіх краін і ўсіх напрамкаў благаслаўлялі вайну і заклікалі веруючых удзельнічаць у ёй.

Тое-ж самае мы наглядаем і ў цяперашні час. Ангельская буржуазія пры падтрыманьні капіталістых іншых краін рыхтуе супроць СССР новую вайну. Распаляючы нянавісьць супроць СССР, буржуазія не сароміцца распаўсюджваць разам з папамі паклёпы на рабочых і сялян.

Ангельская буржуазія бачыць у рэлігійных організацыях сваіх саюзьнікаў. Яна разумее, што ў патрэбны момант знойдзе ў кіраўнікох сэктанцтва і царквы ворагаў рабоча-сялянскай улады. З гэтай прычыны царкоўныя і сэктанцкія організацыі карыстаюцца падтрымкай з-за мяжы.

Але асаблівую ўвагу буржуазія зварочвае на рэлігійную працу ў арміі. У С. А. С. Ш., дзе царква «аддзелена» ад дзяржавы, у арміі служаць папы ўсіх вераваньняў. Усе яны карыстаюцца афіцэрскімі правамі і атрымліваюць вялікую пэнсію.

У польскай арміі знаходзяцца папы таксама ўсіх вераваньняў (папы, ксяндзы, рабіны.). Раніцою і па вечарох салдаты павінны чытаць малітвы.

Рука руку мые.

Духавенства прымае шырокі ўдзел у розных урачыстасьцях армейскіх часьцей, у сваіх казаньнях застапаўліваецца на асобных гэроях, разьвіваючы пачуцьцё нацыянальнай чэсьці. Рэлігія пры дапамозе духавенства служыць сродкам зрабіць салдата пакорным аружжам кіруючых клясаў і разам з тым паслухмянай афярай мілітарызму.

Так, капіталісты разам са ўсім духавенствам, пры яго дапамозе падрыхтоўваюць масы рабочых і сялян да новай вайны супроць СССР.

Нам трэба ўсімі сродкамі і мерамі выкрыць здрадніцкую ролю рэлігіі і духавенства.



РАБОТА ПАПОЎ І ПАЛІЦЫІ ПА ЛЕПШЫХ ДЫРЭКТЫВАХ, ЯКІЯ ДАЎ ІМ ГАСПОДЗЬ ІСУС ХРЫСТОС.

На ўсе дзеяньні нашых ворагаў моладзь павінна адказаць узмацненьнем абароназдольнасьці нашай краіны і выкрыцьцём той агромністай шкоды, якую прыносіць працоўным масам рэлігія. Адначасна трэба падрыхтаваць масу да выкрыцьця тэй здрадніцкай ролі, якую будуць адыгрываць рэлігійныя організацыі ў будучай вайне.

У анты-калядную кампанію ў вёсцы трэба правесьці ў хатах-чытальнях, чырвоных кутках і г. д. гутаркі даклады на тэму «вайна і рэлігія».

Гэта будзе нашым адказам на тую падрыхтоўку да вайны, якую вядуць рэлігійныя організацыі.

Сьцяпанаў.

Плян дакладу „Моладзь і рэлігія“.

1. Уплыў рэлігійных організацый на моладзь. Праца сэктантаў сярод моладзі. Сэктанцкія вечары каханьня, харавыя, драматычныя гурткі, як прывабнасьць для моладзі. Сэктанцкая агітацыя супроць комсамолу і піонэрскага руху. Рэлігійнае выхаваньне моладзі, як дрэсіроўка будучых паслухмяных рабоў капіталу. Каму і навошта патрэбна ў СССР рэлігійнае выхаваньне моладзі.

2. Праца рэлігійных організацый сярод моладзі ў капіталістычных краінах. Дзейнасьць міжнароднага аб'яднаньня каталіцкіх юнацкіх організацый. Хрысьціянскі саюз маладых людзей. Праца рэлігійных організацый моладзі ў каралёвіях. Антыкомуністычная пропаганда, як аснаўная мэта дзейнасьці рэлігійных організацый моладзі ў капіталістычных краінах.

3. УсеЛКСМ і антырэлігійная прапаганда. Уцягваньне рабоча-сялянскай моладзі ў шэрагі саюзу бязбожнікаў. Разаблачэньне клясавай ролі сэктанцкіх спробаў падначаліць моладзь свайму ўплыву. Ліквідацыя незацікаўленасьці, наплюйскіх адносін да пытаньняў антырэлігійнай прапаганды ў шэрагах комсамолу. Антырэлігійная пропаганда ў школе. Антырэлігійная пропаганда сярод піонэраў.

Мэтодычныя ўказаньні.

Мэта дакладу— паказаць, куды вядуць моладзь рэлігійныя організацыі і як трэба весьці барацьбу з іх уплывам на моладзь. Па гэтаму ў пляне дакладу зьмешчаны толькі матар'ялы, маючыя найбольш актуальнае значэньне для гэтай мэты. Але гэта ні ў якім выпадку не азначае, што ў дакладах на гэтую тэму трэба замыкацца ў вузкія рамкі. Сярод моладзі трэба ставіць антырэлігійныя даклады і на агульныя тэмы.

Асабліва падрабязна трэба спыніцца на адносінах сэктантаў да службы ў Чырвонай Арміі, бо здараецца, што жаданьне пазбавіцца ад вайсковай службы зьяўляецца мотывам уступленьня ў сэкты.

Літаратура.

Да першага разьдзелу трэба скарыстаць газэту «Бязбожнік» № 36, за 1927 г.,—у гэтым нумары маецца шмат фактычнага матар'ялу аб тых улоўках, да якіх прыбягаюць рэлігійныя організацыі, каб уцягнуць моладзь у свае шэрагі,—альбо часопісь «Бязбожнік» за 1926 г. № 19—20, маючы такі-ж самы зьмест.



ЯК ПАПА Ў КООПЭРАЦЫЮ НЯ ПУСЬЦІЛІ.

Для другога разьдзелу: Бурас, З.—«Да XII МЮД'у». Часопісь „Антирелигиозник“ № 9, за 1927 г.

Да трэцяга разьдзелу: Алешчук—«Комсамол і антырэлігійная пропаганда», газ. «Безбожник» № 36, 1927 г.; «Аб антырэлігійнай пропагандзе ў школе і сярод дзяцей»—спэцыяльна прысьвечаны гэтаму пытаньню № 11 часопісі «Антирелигиозник», за 1227 г., Буцінцоў—«Сэктанцтва і антырэлігійная пропаганда», выд. «Бязбожнік», 1928 г., цана 30 к.

БАЦЮШКА БЯЗБОЖНІК.

Сказаць па праўдзе, дык ужо гады са два нешта і званы на стальмахоўскай царкве ніколі па ранейшаму не званілі, а так сабе, сяды-тады ў вялікія ўгоднікі ўзьлезе царкоўны стараста Рыгор, папудзіць галак і сіваваронаў, ды патузае крыху за вяроўку. Лянівя яны пабомкаюць ды сьціхнуць.

Хаця у Стальмахове дык і маліцца сур'ёзна няма каму, але зьбяруцца іначды бабы, пашлюць дзядоў сваіх за айцом Міхаілам, каб царкву адамкнуў, пахрысьціцца крыху ўклепчыўшы перад плашчаніцай, ды пойдуць да хаты.—„На ўсякі выпадак хай будзе... а можа бог дзе і ёсьць, але прытаіўся, ды слухае, як з яго пачалі зьдзекавацца: выдумвае карузэ—развазаюць так бабулі, пакідаючы цьвінтар.

Стальмахоўскага бацюшку Міхайла уся вёска паважае: дзяды і бабы, мужчыны і кабеты, дзяўчаты і хлапцы. Нават дзецям і то ён да спадобы.

Дзяды і бабы паважаюць бацюшку за тое, што ён бяз платы іх паспаведае, успомніць памершых, ці пахавае. А калі пажалішся на кашаль, дык і парашкоў пару дасьць.

Мужчыны любяць Міхайлу за тое, што ён майстра на ўсе рукі, ды гаспадар к таму культурны. Зямлі яму далі шэсьць дзесяцін пры земляўпарадкаваньні.

Ня было першы год гною ў бацюшкі. Узяў дазвол Міхайла ў стальмахоўцаў зьбіраць конскі і кароўін кал. Тыдні два славялася бацюшкава сям'я з кошыкамі па выгане, а сам Міхайла ў каламашцы адвозіў сабранае на поле.

На другі год у бацюшкі быў свой гной, ды на полі радзіла, як і ў суседзяй.

Узяўся Міхайла каля агароду тупаць: сад прывёў у парадак ды пчолаў завёў.

Зьбяруцца мужчыны ды пойдуць да Міхайлы:

— Ну, бацюшка, можа пойдзем памолімся!

А Міхайла:

— Сёньня настрою няма, ды ў мяне, браткі, рой павінен выйсьці.

Завернуць мужчыны ў бацюшкаў агарод, усядуцца на лавачку і пачнуць слухаць, як пчолкі гудуць. Сам-жа Міхайла вынясе з хаты журнал пра сельскую гаспадарку і пачне гаварыць, дзе і калі лепш лён сеяць, чаму капуста ў стальмахоўцаў не расьце, ды якая карысьць ад пчол.

Слухаюць мужчыны—аж раты разявяць. Забудуцца і пра багоў і пра чарцей.

Цяпер у Стальмахове амаль у кожнага гаспадара—сад, пчолы, капуста, канюшына, сарадэля. Нават колектывам набылі сеялку і жнярку.

Вось таму і любяць мужчыны Міхайлу.

Моладзь з павагай адносіцца да бацюшкі за тое, што ён развучвае і імі ўсе песьні новага быту ды навучыў скакаць лявоніху з кадрыляю.

Стальмахоўскі бацюшка добры сталяр. Ён зрабіў дзьве чатырохвёсельныя лодкі. Як прыдзе лета, дык дзеці і прападаюць цэлымі днямі ў іх на рэчцы; вось таму для іх бацюшка—добры дзядзька.

Ідучы з сенакосу, ці седзячы на прызьбе ў сьвяточныя дні, некаторыя больш набожныя мужчыны занепакояцца:

— І што выйдзе з нашага бацюшкі, дык я і на вум сабе не вазьму?

— Гэта-ж мудрэй за комуніста якога!

— Пытае, што выйдзе?—сьвет такі настаў, усё да гары нагамі і пашло.

... Удалося добрае надвор'е.

Над вёскаю Стальмахі стрэслася нечаканае: з самай раніцы звоняць званы, ды так моцна, так працяжна, гулказычна, які ніколі ў апошнія гады.

Тых, хто ўжо забыўся на бога, мучылі думкі:—„Няўжо бацюшка Міхайла па ранейшаму возьмецца за царкву... Што-ж ён нарабіў з намі“.

А тых заўзятых набожнікаў, якія ніяк не маглі адракнуцца ад веры ў усявышняга, радавалі здагадкі: „Да пары жбан ваду носіць. Зьнівіўся, мабыць, бог, ды загадаў Міхайлу па ранейшаму служыць“.

Усе думалі па рознаму, і ў кожнага на твары зьяўляліся рыскі неспакою.

Малаўкаю абегла ўсе хаты Рыгорава жонка і запыхаўшыся апавясьціла, што казаў бацюшка, каб усе зьбіраліся ў царкву—маліцца будзем. І дадавала ўсюды ад сябе: «людцы, дарагія, нешта мусіць нядобрае здарылася, калі-ж бацюшка такі сур'ёзны, такі сур'ёзны».

... Валам валіў народ у царкву. Стараста Рыгор выкапаў яшчэ недзе з сотню сьвечак, стаў з боку кліросу і прадаваў па зьніжанай цане. На ўсіх падсьвечніках гарэлі дзесяткамі сьвечкі. Паветра перапоўненай кажухамі і хусткамі царквы пахла пустой камяніцай. Мужчыны пераглядаліся паміж сабою і ціха шапталіся. Бабы клечылі каля божай маці і залпам па некалькі разоў хрысьціліся...

Расчыніў бацюшка Міхайла царскія дзьверы і ў поўным папоўскім абмундзіраваньні паўстаў перад народам. Яшчэ больш жахнуліся стальмахоўцы—„што такое сталася?“

Бацюшка падышоў да століку, што стаяў у галавах плашчаніцы, абапёрся рукамі на яго, як дакладчык на трыбуну, і пачаў спакойным аднатонным убаюкваючым голасам, павольна, адно слова ад другога на вялікай адлегласьці, ўвапёршыся вачыма у пакравіцеля жывёлы, Юр'я пабеданосца:

— Больш пятнаццаці гадоў служыў я ў гэтай царкве. Больш тысячы разоў я ўстрашваў вас з гэтага месца рознымі пакараньнямі за непаслушэнства богу. Сотні бедных стальмахоўцаў пухлі з голаду і на апошнія капейкі рабілі падарункі богу. Вы, вашы бацькі і дзяды вякамі прасілі бога палепшыць ваша жыцьцё, а ня ведалі, як пазбавіцца ад капуснага вусеню і ад каляд карміліся мякінаю.

Доўга гаварыў бацюшка Міхайла. Ён так прыгожа гаварыў, з такою шчырасьцю, што, здаецца, сам прыслухоўваўся да музыкі свае прамовы, піў яе асалоду і больш для яго ў царкве быццам нішто не існавала.

Дакладваў бацюшка і пра бога і пра яго сына Хрыста і пра Міколу Чудатворца, і пра Спаса і пра сакрэты хрышчэньня. У акамяненьні стаялі стальмахоўцы, баяліся пераступіць з нагі на нагу, каб гэтым не парушыць спакой, лавілі кожнае слова і нічога не разумелі.

— Я сёньня склікаў вас сюды,—павысіўшы голас працягваў Міхайла,—не для таго, каб па ранейшаму чытаць вам божыя натацыі, я сёньня сабраў вас сюды не для сьпяваньня трапароў і малітваў аб нараджэньні сына божага ад непарочнай Марыі. Я хачу прад вамі сёньня, у такі вялікі дзень, урачыста і адважна скінуць з сябе гэтае пазалочанае убраньне...

Міхайла у роспачы сарваў з галавы камілаўку, вылузаўся з рызы, усё скамячыў у кучу і са словамі—я вам больш ня слуга, мазаныя багі—кінуў у іканастас.

Плюнуў бацюшка каля царскіх дзьвярэй, расьпёр ботам і зьвярнуўся да стальмахоўцаў, якія ад нечаканасьці прышлі ў замяшаньне:

— Для вас я сёньня не бацюшка Міхайла, а проста:—Міхайла сусед, Міхайла брат, Міхайла кум, Міхайла сват...

У гэты час у сельсавеце былі ў поўным зборы комсамольцы.

Міхайлаў сын Ігнась, як убачыў, што бацька скінуў рызу с плеч, як стаенны, пабег да комсамольцаў і апавясьціў аб здарыўшымся.

Нехта прапанаваў:

— Бяры, хлопцы, сьцяг, ды крой у царкву на сход!..

Дружная комсамольская калёна з піонэрскім хвосьцікам пад гукі песьні „адрачэмся ад старага сьвету“ бадзёра крочыла ў царкву, якая з сёньняшняга дню завецца—„Стальмахоўскі народны дом“.

Зьм. Паваротны.

Па-разумнаму, ды па-новаму



Адмірае

КРАПІВА

Дабяромся і да неба.

Бог высокі, бог далёкі,
Няпрыступны, страшны бог!
Ты залез аж на аблокі,
Каб дайсьці ніхто ня мог.
Абхваціць ня могуць вочы
Вялізарны твой палац.
Ліхтары і ў дзень, і ў ночы
Там, ня тухнучы, гараць.

Хор анёлаў там ад ранку
І да ранку аж грыміць.
Хэрувім з мячом ля ганку,
Як укопаны стаіць.
А вунь там, у кутку неба,
Куча топчацца сьвятых—
Як якая дзе патрэба,
Пасылаеш туды іх.
І жывеш сабе на небе
Ты бяз пэндзы, без клапот,
Ты ня думаеш аб хлебе,
Ня ліеш над працай пот.

Чалавек-жа здабывае
Цяжкай працай тут яду
І ў жыцьці сваім страчае
Заўжды гора, ды бяду.
Але ў муках і бяз хлеба
Не захочам жыць мы век—
Дабярэцца і да неба
Разззлаваны чалавек.
Дасьць сьвятым ён на гарэхі
І анёлам дасьць на чай,—
Будзе з імі там пацехі,
Ды і ты, брат, выбачай:
Мусіць, трохі давядзецца
І табе папрацаваць,

Бо заставім мы, як сьпеца,
Новы сьвет нам будаваць;
На паёк цябе пасадзім
Ды патрэбуем налог,
Вось тады мы і паглядзім,
Што за птушка стары бог.

Ды глядзі, каб сабатажам
Не займаўся, а то мы
Так, як бач, табе пакажам
Шлях—дарогу да турмы.

Гані мешалкай.

Вось вадохрышча ўжо ідзе,
Ужо прыбліжваецца.—
Поп талкуе з пападзёй
Ды аблізваецца.
Скора ў вёсцы, дзе ні глянь,
Пойдзе вуліцай
Валасатая та здань
Пакаўгуліцца.

Пойдзе ён «па калядзе»,
Зеляпаючы,
На «ярданскай» на вадзе,
Зарабляючы,
Са старцамі за кускі
Будзе лаяцца
(Добра—тут бальшавікі не
мяшаюцца).

І «авец» пачне крапіць
Ён вадзіцаю,
Стане вочы ім сьляпіць
Нябыліцаю.
Ня цікаўся-ж, селянін,
Яго песенькай—
З хаты лодыра гані
Проста мешалкай!

Рэлігія--ёсьць род духоўнай сівухі, у якой рабы капіталу топяць свой чалавечы воблік, свае патрабаваньні на колькі-небудзь дастойнае чалавечае жыцьцё.

ЛЕНІН.

Вечар „спартыўнага сьмеху".

І Бег у мяшкох.

Гульцы падзяляюцца на дзьве роўныя партыі, побач адзін з другім, у кожнай партыі стаяць патыліцай адзін да другога. Бягучыя адзяюць мяшкі. Дабягаюць да вызначанага месца, вяртаюцца назад, п радаюць мяшок наступнаму. Выгульвае партыя, якая хутчэй прарабіла патрабуемае.

Бег у дваіх на двух нагах.

Становяцца шчыльна адзін з адным, падтрымліваюць адзін правую, другі левую нагу рукамі і бягуць.

Бег скачкамі.

На падлозе, на працягу ўсяго шляху па прызавай лініі, кладуць кіі ці вузкія стужачкі з белага палатна на аднолькавай адзін ад другога адлегласьці (прыблізна на два крокі). Па сыгналу з шэрагу рыхтуючыся ўзяць прыз пачынае бег права-флянговы, і калі ён дасягае канца, бяжыць наступны. Бягучыя павінны скакаць так, каб толькі адзін раз даткнуцца нагою падлогі ў кожным прасторы паміж кіямі і стужачкамі. Адлегласьць ня больш 50 крокаў.

Удваіх на трох нагах.

Гульцы падзяляюцца на пары (лепш, калі яны складзены з людзей аднаго росту) і становяцца ў парах адзін к другому бокам: стаячы на правы бок абнімае сваей левай рукою шыю таварыша, а той, у сваю чаргу, абнімае яго шыю сваей правай рукой.

Потым, ля ступнёў і вышэй кален левую нагу стаячага з правага боку зьвязваюць з правай нагой стаячага з левага боку, так што дзьве зьвязаныя нагі прадстаўляюць як-бы адну. Па сыгналу пары бягуць да вызначанага месца. Адлегласьць павінна быць ня больш 10 крокаў.

Пластуны.

Гульцы кладуць рукі на падлогу і выцягваюцца ва ўсю даўжыню назад. Па пададзенаму знаку яны ідуць на руках уперад, цягнучы ногі па падлозе.

Двое сьляпых.

Лік гульцоў—ад 10 да 25 чалавек. Гульцы, узяўшыся за рукі, становяцца ў кола, стаяць ціха; дваім вышаўшым на сярэдзіну кола завязваюць вочы. Аднаму з іх даецца сьвісток (ці званочак), у які апошні на пытаньне: „дзе ты"—сьвішча, а другі на гэтаму гуку стараецца яго злавіць. Калі яму злавіць удасца, дык яны мяняюцца ролямі, а калі і гэты зловіць, дык на іх месца выходзіць другая пара.

Сьляпы шэраг.

На прызавой лініі становяцца ў шэраг з завязанымі вачыма гульцы.

Па ўмоўленаму сыгналу, са сьпевамі ці пад музыку, яны пачынаюць рух у такт музыцы і стараюцца прымаць кірунак да мэты. У часе маршу гульцы з мэтай «не˛ваткнуцца» выцягваюць уперад рукі; па камандзе „стой" гульцы спыняюцца; той хто будзе ў гэты час стаяць бліжэй да мэты лічыцца пераможцам і атрымлівае прыз.

Часам гэта спаборніцтва некалькі зьмяняюць. Ля прызавой лініі стаіць хор ці іграючыя на балалайцы, гітары, мандаліне і г. д. Па пададзенаму знаку хор пачынае сьпяваць ці музыканты іграць; удзельнікі ў спаборніцтве пачынаюць рухацца ў бок сьпяваючых ці іграючых, стараючыся па слуху дайсьці да мэты. Але сьпявуны ці музыканты, прадаўжаючы сьпяваць ці іграць, непрыкметна адыходзяць у бокі ад мэты ці мяняюць кірунак некалькі разоў, і гульцы па слуху трымаюцца кірунку, нехаця ўхіляючыся ад прызавой лініі.

Цягні ў кола. (Месца для гульні—вялікі пакой).

На падлозе выводзіцца крэйдаю невялікае кола. Гульцы, трымаючыся за рукі, становяцца вакол яго, тварам у сярэдзіну. Па пададзенаму сыгналу ўсе гульцы стараюцца прымусіць сваіх суседзяў ступіць у кола, хоць-бы адной нагою.

Уступіўшы ў кола выходзіць з гульні. Калі толькі застаўшыхся гульцоў не хапае, каб ахапіць гэтае кола, дык вышаўшыя з гульні зварочаюцца і гульня пачынаецца нанава.



Малюнкі аб нараджэньні Хрыста.

Організоўвайце гульні на сьнягу!

Салка

Гульня адбываецца на ільду, лепш яе праводзіць на каньках. Кожны ўдзельнік гульні мае кій з загнутым канцом і кавалак дрэва альбо мячык. Адзін з гуляючых водзіць мячык па ільду так, каб ён зачапіў чый-небудзь мячык. Калі яму гэта ўдасца, дык водзіць той, чый мяч яму ўдалося «пасаліць».

Вяліканы.

Граючыя падзяляюцца на 2 партыі. Кожная з партый будуе сабе з сьнегу вялікана, прычым галава прыстаўляецца асобна і падрыхтоўваецца некалькі галоў. Сутнасьць гульні зьяўляецца ў тым, каб зьбіць галаву ў вялікана. Партыі ўмаўляюцца чым яны будуць зьбіваць галавы: ільдзінкамі, альбо сьнежкамі; сколькі зьбіць галоў і на якую адлегласьць. Апошняя адзначаецца рыскай.

Гульня лічыцца выгулянай той партыяй, якой удасца хутчэй зьбіць вызначаную колькасьць галоў. Замест зьбітай галавы, ставіцца новая, і так да таго часу, пакуль ня будуць зьбіты ўсе.

Паміж двух цытадэляў.

Удзельнікі гульні падзяляюцца на дзьве партыі. Поле падзяляецца на дзьве часткі рыскай. Кожная партыя будуе на сваёй палове цытадэль з адным уваходам (ззаду). Партыяй кіруе абраны кіраўнік.

Гульня заключаецца ў тым, каб перацягнуць праз рыску і ўцягнуць у палон праціўніка і засадзіць у цытадэль, дзе палонныя сядзяць да таго часу, пакуль іх ня выручаць.

Правілы.

1) Захоплены гулец можа вырывацца да таго часу, пакуль ня будзе пасажаны ў цытадэль.

2) Палонны вызваляецца, калі да яго дакранецца гулец сваёй партыі, якому ўдалося дайсьці да цытадэлі і ня быць туды ўштурхнутым.

3) Выручаны гулец павінен зьвярнуцца на сваю палову поля гульні, і покуль ён туды ня дойдзе, яго нельга чапаць, але ён ня мае права ў гэты час прымаць удзел у барацьбе.

4) Гуляючыя могуць пераходзіць мяжу з мэтай выручыць палонных альбо дапамагчы таварышу, якога цягнуць у цытадэль, але забараняецца цягнуць у сваю цытадэль праціўніка, знаходзячыся на яго тэрыторыі.

5) Цягнуць у палон можна ўсякага гульца (акрамя паказаных у пункце 3), якія знаходзяцца на тэрыторыі «ворага», але цягнуць яго можна толькі стоячы на сваёй тэрыторыі абедзьвымі нагамі.

6) Калі ў палон пападзе кіраўнік, дык адбываецца абмен палоннымі ў роўнай колькасьці.

7) Выгульвае партыя, забраўшыя ў палон усіх праціўнікаў.

8) Чаму-небудзь вышаўшыя з гульні раней яе сканчэньня лічацца палоннымі.

Юла.

Гульня адбываецца на ільду. Гуляючыя становяцца кола на адлегласьці двух крокаў адзін ад другога. Адзін з гульцоў становіцца ў кола і пачынае «вастрыць» «юлу» (кавалак дзерава альбо мяч) і стараецца выбіць яе з кола. Вадзячы павінен папасьці юлой каму-небудзь па назе. Калі-ж прамахнецца і юла выйдзе з кола, дык ён павінен за ёй пабегчы і пачаць зноў з цэнтру. Той, у каго юла пройдзе справа, павінен вадзіць.

Сьнежкі.

Колькасьць гульцоў неабмежавана. Гуляючыя падзяляюцца на дзьве партыі, разыходзяцца ў бакі на адлегласьці 20-30 крокаў адзін ад другога. Пачынаецца перапалка. У сьнежкі гуляць можна ў цёплае надвор'е, калі сьнег лёгка можна ператварыцца ў ком. Ня раіцца рабіць сьнежкі да абляднеьня, таму што цьвёрдай сьнежкай можна моцна ўдарыць.

Гульня вельмі цікавая, ня гледзячы на сваю прастату. У вёскі яна шырока распаўсюджана.



НА ЛЫЖАХ.

**ЗАМЕСТ П'ЯНАГА КАЛЯДНАГА „БАРА
РАЕ, ЦІКАВАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ. ХАЙ ПАПЬ
„РАЖДЗЯСТВО ТВАЁ, ХРЫСЬЦЕ БОЖ
ТАЛЬНІ ПАД ЗЫЧНЫЯ ГУКІ ГАРМОНІ
МОЛЬСКУ**

Хатнія гульні

Згубленае імя.

Усе ўдзельнікі гульні дзеляцца на пары (хлапец з дзяўчынай) і садзяцца ў кола; адзін з іх ня мае сабе пары, і побач з ім—вольнае месца. Кожны ігрок мяняецца імем са сваім суседам у пары.

Ігрок, які ня мае пары, выклікае, чыё небудзь імя з прысутных; „гаспадар" выкліканага імя ў даны момант перамяшчаецца на свабоднае месца і зноў мяняецца імем са сваім новым суседам. Той, хто застаўся бяз пары, выклікае наступнага і гэтак далей. Праз некалькі хвілін гульні імя зусім губляецца і ніяк нельга адгадаць, хто выйдзе, калі назваць сваё імя.

Багаты выбар.

Гульцы дзеляцца на дзьве партыі — хлапцоў і дзяўчат. Адна партыя пакідае памяшканьне, другая-ж садзіцца ў шарэнгу, маючы каля сябе вольнае месца. Потым кожны з тых, што заставаліся ў пакоі, па ўзаемнаму дагавору выбірае сабе каго-небудзь з процілежнай партыі.

Гульня зьяўляецца ў тым, каб адгадаць, хто каго выбраў Для гэтага гульцы з тае партыі, якая пакідала пакой, прыходзяць і па чарзе садзяцца на адно з вольных месц. Калі ён адгадаў, дык і застаецца сядзець там да канца гульні. Калі-ж ён сеў не на сваё месца, дык яго «прасьвістваюць», усьлед за ім выходзіць другі гулец і так да апошняга. Не адгадаўшыя ад першага разу, калі да іх даходзіць чарга, спрабуюць адгадаць другі раз сваё месца. Калі ўсе адгадалі свае месцы, тады партыі мяняюцца сваімі ролямі.

Не зявай!

Усе гульцы садзяцца ў кола, у сярэдзіне якога становіцца вадзячы. На каленях аднаго з удзельнікаў гульні ляжыць хустка. Суседзі яго з абудвых бакоў стараюцца гэту хустку ўзяць сабе на калені. Вадзячы-ж у гэты момант, калі ўтвараецца гэта перадача, імкнецца захапіць руку разам з хусткай. Захоп рукі бяз хусткі, або хусткі без адначасовага захопу рукі ня лічыцца. Злоўлены з хусткай робіцца вадзячым.



СКАРЫСТАЙ Г

**Каляды для вясковай моладз
гэтыя дні моладзь мае больш, як
мольскім ячэйкам трэба паклапаці
кава, весела і разумна.**

**П'яным вячоркам, «баранам»,
ладзьдзю суседняй вёскі. мы паві
самольскую вячорку, разумныя за**

**У гэтым нумары нашай газэ
ялу, які можа ўнесьці ў каляднук**

**Для культурна-масавай працы
ступную літаратуру: Крапіва—«Бібл
кач—«Пра папоў» пра паноў, пр
зборнік «Камсамольскія вячоркі»; Т**

Усе гэтыя кніжкі можна набы



*— Усемагутны наш, калі
сына.*

*— Ідзі ты к богу з нарадз
хаўтурамі пахне...*

Комсамольскі гумар

Япрук і бог.

Цімошка прыставаў да маткі:

— Мама, хіба трэба выгнаць япрук з хляўчука?

— Ды ня трэба, бог з ім.

— Ну, калі бог з ім, дык яму к
сумна, можа і дагаварыцца аб сім.

Новае ў старым.

— Скажэце, каля ласка, як называец-
ца гэта царква?

— Клюб імя тав. Ігнатоўскага.

«Антырэлігійны».

— І ня сорам табе, Васька, у царк-
хадзіць!

— Ды, далібог-жа, я не хаджу.

— Хлусіш. Як толькі ўвайшоў я, ды
зразу цябе заўважыў каля вобраза Мі-
колы.

Бязбожніца.

У бабкі Сьцепаніды ў хатцы, куды не павернешся, усюды вачмі ў абразы ўвапрэшся.

Кожнаму абразу сваё месца адведзена: у чырвоным вуглу Спас руку падняў. па бакох сьвятыя перстамі награжаюць.

Глядзі, Сьцепаніда, не грашы!

Ну і як пасьля гэтага бога не баяцца?

Баіцца бабка бога,—вой, як баіцца!

Устрашышся, калі пачуеш бацюшку ў царкве, як пачне мукі адзкія перабіраць.

Што ні мука—дрыжыкі прыймаюць.

У жах прыводзяць мукі, ды хоць-бы толькі на тым сьвеце, а то і на гэтым чэрці спакою не даюць,

Чэрці горш за татарына—шурумбурумшчыка.

На людзях яшчэ туды-сюды, пабайваюцца трохі, а толькі хацёнку Сьцепаніды ахутае цемра, і возьмуцца розныя штукі выраблядь: то ў дзьверы кіпцюрамі пачнуць драпаць, то на гары гаршкамі і кошыкамі пачнуць кідацца.

Ні жыва, ні мёртва ляжыць бабка на печы, ляжыць і губамі „сьвят-сьвят" па-маленьку шавяліць, зморыцца, так на „сьвят-сьвяце" і засьне.

Уся бяда ў тым, што адна адзінютка бабка ў хатцы жыве.

З усяе радні толькі і засталася ў жывых адна ўнучка Тэклячка.

Жыве Тэклячка ў горадзе, на фабрыцы, гады ў рады і ў вёску заглядае.

І даканалі чэрці бабку. так даканалі,—далей цярпець так нельга. Напісала ўнучцы ліст і паскардзілася на чарцей.

А Тэклячка—бух: «Мабыць рабіць табе няма чаго, калі розныя брыдоты ў галаву бярэш"...

Паматала, паматала галавою бабка і...

— Бог з табою!..

На каляды прыехала Тэклячка. Павесялела бабка.

Ноччу што-небудзь зашастае, бабка з печы—„сьвят, сьвят"... Тэклячка з палатак—„га-га-га".

Бабка у апраўданьне размову пра чарцей распачне, а ўнучка і слухаць ня хоча.

Сьцепаніда не змаўчыць:

— Тэклячка, глядзі, бог табе за гэта не даруе,.. памянеш маё слова, што праз бо табе ўсё вылезе.

— Ніякага бога і няма!

— Што-о?

— Бога няма і чарцей няма?

— Што чаўпеш, як гэта няма?

— Так і няма...

— А на абразох чаму намалёваны?

— Так, папрасна!

— Ой?

— Выдумка...

І давай, і давай Тэклячка бабкіну веру богу на чыстую вадзіцу выпускаць, да ўс узялася каля яе, што і пылу не засталося.

Слухае бабка, верыць ня верыць, ужо-ж вельмі складна хлусіць унучка, магчыма і ня хлусіць, а магчыма...

Засьне бабка і праз усю ночку і не перавернецца.

* * *

Сьвятам пазнялася бабка яшча да сьвітаньня, каб да абедні ў хапе падубравіцца.

Не пасьпела і карову падаіць, як ужо званіцы: бом-дзі-лім... бом-дзі-лім...

Бабка затрывожылася: мабыць, айцец Аляксей сьпешку наганяе, ён заўсёды за абедню трусцоў гоніць.

Яна ў хату з даёнкаю,—а на званіцы дрым-ба-ба... дрым... Трызвон да пачатку, Тэклячка на палацях храпунца задае.

— Тэклячка! Тэклячка, хопіць табе валяцца, у царкву ступай.

— Спаць ахота!

— Ну дык малако працадзі... Я пайду...

— Гэта можна.

— Глядзі, накрый... каб кошка не хлабтала.

Пакуль бабка зьбіралася, пакуль прышла у царкве айцец Аляксей ужо адбарабаньваў абедню.

…у правядзем мы калядныя дні.

…НА", „КАТА", ПАНАЖОЎШЧЫНЫ—БАДЗЁ… У АПУСЬЦЕЛЫХ ЦЭРКВАХ СЬПЯВАЮЦЬ …ІА"; МОЛАДЗЬ У КЛЮБЕ, У ХАЦЕ-ЧЫ…У І ЦЫМБАЛАУ—ЗАЦЯГНЕ СВАЮ КОМСА…ЮЮ ПЕСЬНЮ.

…ЭТЫ МАТАР'ЯЛ


…і—гэта час адпачынку ад працы. У …залі вольнага часу. Вясковым комса…цца, каб гэты час быў скарыстаны ці…

…бойкам моладзі аднае вёскі з мо…ны проціпаставіць сваю, новую, ком…авы, катаньні з гор і г. д.

…ты мы даём шэраг выбранага матар'…вячорку жывасьць і зацікаўленасьць. …ў калядныя дні раім скарыстаць на…ія» і зборнік вершаў «Крапіва»; Дзяр…а сялян бедакоў»; З. Паваротны—…арас Гушча—«У ціхай вадзе». …ць у кнігарнях Белдзяржвыдату.



…ласка, узглянеце на нараджэньне …сэньнем. Тут для нашага брата



У клюбе.

Народны анэкдот

Ці была ў папа галава, ці не?

Раз адзін чалавек пасеяў жыта на палянцы. Жыта не ўрадзіла. На другую вясну прыехаў чалавек ды пасеяў грэчку—і грэчка не ўрадзіла. Стаў ён і гадае: што гэта за месца такое, што нішто ня родзіць. От ён пасеяў солі—і соль ня вырасла. Раз прыходзіць ён на палянку і ўгледзеў сьляды мядзьведзя і кажа, што гэта казюлька пераходзіць, таму нішто і ня родзіць. От яны пазвалі папа, каб ён адправіў малебен. Поп, едучы, угледзеў гняздо мядзьведзя, пазваў людзей і кажа: «гэта тая казюлька, што пераходзіць праз поле. Забіць яе трэба! Лезьце, бецье!»—Ніхто ня хоча. І палез сам поп у дупло, толькі ўніз галавою. Прылез да самага мядзьведзя, а мядзьведзь узяў ды папу галаву адкусіў. Ждуць людзі папа час, ждуць другі - няма іх папа. Сталі яго цягнуць за ногі з дупла, выцягнулі, зірнулі,—ажно няма ў папа галавы. Адны кажуць, што казюлька адкусіла, а другія кажуць, што ён гэтак прыехаў з дому.

От яны паспорылі ды пабіліся. Пашлі пытацца ў фурмана, які вёз папа. Хурман кажа: «я хоць вёз, ды ня ведаю, як ён быў, але, здаецца без галавы, а можа і з галавою. Папытайцеся ў наймічкі: яна ведае, яна ўчора часала яму косы». Пашлі, пытаюць: ці ня ведаеш ты, ці была ў папа галава? Яна кажа: «я хоць часала яму косы, але забылася».

Так нашы мужыкі ўсё пыталі ды пыталі, а толку не дабралі: ці была ў папа галава, ці не? Так і засталіся ня ведаючы.

Фізычныя фокусы.

Сухі вадалаз.

Для пабудовы гэтага фокусу трэба ўзяць нізкую шырокую пробку і ўмацаваць на ёй невялікую (сантымэтры ў 2-3) фігурку чалавека (вырэзаць з кардону і прыкалоць булаўкаю). Потым узяць вялікую шкляную банку, напоўніць яе вадою і пусьціць туды пробку з фігуркай. Нарэшце, прыгатаваць звычайную шклянку.

Скончыўшы ўсе гэтыя прыгатаваньні, фокусьнік гаворыць, што вадалаз будзе апушчацца ў ваду, а з вады заўжды выходзіць сухім. Для падцьвярджэньня гэтых слоў вадалаза накрываюць шклянкаю, якую апушчаюць на дно банкі. Вадалаз разам са шклянкаю апушчаецца пад ваду. Калі-ж шклянку вымаюць назад, вадалаз таксама выскаквае, пры чым будзе зусім сухім.

Тлумачыцца гэты фокус тым, што ў шклянцы знаходзіцца паветра. Калі шклянку апушчаюць у ваду ўверх дном, вада ў яе ўвайсьці ня можа, таму што яе ня пушчае паветра. З гэтай прычыны папяровая фігурка вадалаза застаецца сухою. Паветра, як усе целы, займае месца і пры апусканьні шклянкі ў ваду рухаецца разам з ёю, выціскаючы ваду.

На гэтым законе аснована пабудова вадалазнага колакала, у якім адбываюцца розныя працы на дне рэк, вазёр і марэй.

Кіпячэньне вады ў папяровай пасудзіне.

З квадратовага куска пісчай паперы трэба зрабіць скрыначку. Да чатырох кутоў скрыначкі трэба прымацаваць нітку, за якую павесіць скрыначку на канец якога небудзь кіёчка ці алоўка. У скрыначку трэба асьцярожна наліць вады ў такой колькасьці, колькі яна зможа вытрымаць, падставіць зьнізу сьвечку і падаграваць. Вада сагрэецца і закіпіць, а папера не загарыцца.

Тлумачыцца гэта тым, што папера няможа нагрэцца да той высокай тэмпературы, якая неабходна для згараньня таму, што ўся цяплыня ідзе на нагараваньне вады. У часе-ж кіпячэньня ўся цяплыня ідзе на ператварэньне вады ў пар, прычым колькі-б мы ня грэлі кіпячую ваду, тэмпэратура яе ня ўздымаецца, застаючыся заўжды роўнай 100° С.

Незгараючая тканіна.

Ёсьць яшчэ адзін фокус, падобны толькі што апісанаму. Для яго пабудовы шчыльна абцягваюць тонкаю крамнінаю жалезную гірку і на гладкую паверхню крамніны кладуць распалены вугаль. Насуперак чаканьню, крамніна доўга ня будзе запальвацца, хоць-бы вугалёк нават раздувалі.

Жалеза, як і вада,—добры праваднік цяплыні. Яно лёгка успрымае цяплыню, якая па ім хутка разыходзіцца. З гэтай прычыны ўся цяплыня распаленага вугалька хутка пераходзіць на жалезную гірку, а крамніна доўга ня можа нагрэцца да той тэмпэратуры, пры якой пачынаецца гарэньне крамніны. Чым танёй крамніна і чым шчыльней яна прылягае да жалеза, тым лепш выйдзе фокус.

Ліпкая шклянка.

Вазьмеце шклянку з вадою, узьлезьце з ёй на стол і прыткніце шлянку да столі, абвясьціўшы прысутным, што пасьля некаторых падрыхтаваньняў вы прымусіце шклянку прыліпнуць да столі.

Потым вы просіце каго-нібудзь з прысутных узяць тоўстую палку (прырыхтаваную загадзя), стоячы на падлозе, уперціся яе канцом у дно шклянкі і, такім чынам, падтрымаць яе.

Калі такі ахвотнік знойдзецца і зробіць тое, што вы ад яго прасілі, зьлезьце са стала і аднясеце яго ў бок.

Папярэдзіўшы, што вы на хвілінку павінны адхіліцца, каб зрабіць патрэбныя для фокусу падрыхтаваньні, выходзіце ў другі пакой.

Праходзіць некалькі хвілін—вас няма, прысутныя ідуць за вамі, а той, хто трымае шклянку палкаю, ніяк ня можа адыйсьці, бо вада пальлецца на яго.

Калі прысутныя зразумеюць, у чым справа—будзе шмат рогату, бо той, хто трымае шклянку, будзе стаяць у небясьпечным становішчы да таго часу, пакуль хто-небудзь не дапаможа яму дастаць шклянку з вадой.

Што трэба для паказаньня.

1. Шклянка з вадой.
2. Тоўстая палка.
3. Стол.

Хэмічныя фокусы.

Цудоўнае ператварэньне жалезных цьвікоў у медныя.

Вазьмеце расчын меднага купаросу, які гатуецца так: на $1/2$ літра вады распусьцеце 100 грам меднага купаросу. Робіцца гэта загадзя. Потым пастаўце на краі стала дзьве шклянкі так, каб гледачом было відаць, і наліце ў іх да паловы меднага купаросу. Тым часам няхай ваш памоцнік раздае прысутным звычайныя жалезныя цьвікі для агляду. Цьвікі бяруцца новыя. Па меры таго, як цьвікі ад гледачоў будуць зварочвацца, вы кідайце іх у шклянку з медным купаросам. Праз 5-10 хвілін вы касьцяною лыжачкаю вымаеце іх і асьцярожна высушваеце прапускною папераю і перадаеце гледачом для агляду ўжо медныя цьвікі. Парайце жадаючым узяць цьвік на памяць.

Што адбылося з цьвікам? Ён пакрыўся медзьдзю, якую ён выціснуў з меднага купаросу, а частка жалеза з цьвіка выйшла і заняла месца медзі ў медным купаросе.

Гэтай рэакцыяй карыстаюцца ў тэхніцы, калі хочуць „высадзіць" медзь з якіх-небудзь раствораў. Вядома, медзь на цьвіку не ляжыць тоўстым пластам і яе лёгка саскрэбці.

Атрыманьне «жэртвеннага агня».

Вазьмеце грамаў 5-8 крышталікаў марганцава-кіслага калія (прадаецца ў аптэцы, як «марганцаўка»), пасыпце іх на талерачку і падлейце крыху сярчанага квасу і мяшайце да да атрымання кашыцы. Вазьмеце цяпер гэтай кашыцы і намажце па другую талерачку, а зверху пакладзеце тонкіх сухіх трэсачак, расклаўшы іх у выглядзе кастра.

Калі ўсё будзе прыгатавана, вы палівайце «касьцёр» драўляным сьпіртусам, ці змачэце добра сьпіртусам рукі і скапаеце з іх сьпіртус на талерку з кашыцай. Адразу-ж пасьля гэтага ўспыхвае «жэртвенны агонь», на якім можна смажыць колькі хочаш „бараноў".

З кашыцай зварачацца трэба вельмі асьцярожна: ня браць рукамі, а шкляным кіёчкам. І ім-жа рабіць намазваньне талеркі.



У трох ліцах.



Камсамольскія каляды.

Багамольле.

Праўду кажа пагалоска,
Што ў папоўскай павуціне
Наша хатачка і вёска
Бяз жыцьця і сьвету гіне.

Ой, каб ведалі, браткі, вы,
Як да нельгасьці абрыдла
Мне пісаць ужо пра грывы
І пра ўсякія кадзілы.

Але што-ж рабіць поэце,
Калі ўзяў ён за ахвяру
Дзеркачом служыць у сьвеце
І ў кут зьмятаці мару?

Прызнаюся вам—ніколі
Не хадзіў я сам да прошчы,
Бо з маленства чуў даволі,
Як папы рабілі мошчы.

Не на жарты і бяз злосьці,
Гавару—як трэба, стала,
Што яны на гэта косьці
Бралі-кралі, дзе папала.

На кладох ці ля стадолы—
Усё роўна—будзе добра!
Хоць якой сабе жывёлы—
Абы чэрап, ногі, робры!

У мяшку—заместа скуры—
Усю трухлявіну манахі
Скруцяць, зьверцяць у фігуры...
І—гатоў: цягні пад пахі!

Людзям выставяць салому
У панчохах для прывабы,
І—глядзіш: сьвятому тому
У пяту ўжо плюшчаць бабы!

Дый мужчыны не ад тога—
Як і бабы, ў адну кроплю:
Цягнуць ў цэркву для сьвятога
Кужаль, зрэб'е і каноплю.

Ў ліхтары наставяць сьвечак
І загрукаюць ў падлогу,
Як маркач сярод авечак
З маркачом у перамогу.

А на хвост— дальбог умора
(З Новагрудчыны узята)—
Цэркаў проста, як абора:
Оўцы, куры, парасяты.

Лезуць ў самую бажніцу,
Лычам поруцца ў дзяругу,
Рвуць зубамі за спадніцу,
Хоць бяры у рукі пугу!

Поп на гэта не зважае
І, здаволены да сьмерці,
Цераз шчолку пaглядае:
«Будзе чым кішку наперці!

Дзяк таксама ня увалак:
У думках пхне у торбу-ляпу
То сьвіняціны кавалак,
То авеччую ахлапу.

Добра гэтак і маліцца:
Горла ёсьць за што падраць,
Бо за гэта «да сьвяціцца»
Ён поўгода будзе жраць...

Але глянем, што ў падзяку
Бог пашле—і то часамі—
Селяніну-небараку:
Толькі бульбу «з мундзярамі»!

Дык скажэце-ж—на хваробу
Слухаць мне цаповы казкі,
Каб яны маю вантробу
Аб'ядалі з «божай ласкі»?

Годзе ім сядзець на карку!
Я сваiму дзіцяці лепей
Дам якую-небудзь скварку,
Чым трымаць на поснай рэпе!

А. Дзяркач.

Ніякая прасьветная кніжка ня вытравіць рэлігii з забітых капіталістычнай катаргай мас, залежачых ад сьляпых руйнуючых сіл капіталізму, покуль гэтыя масы самі не навучацца аб'яднана, організавана, плянава, сьвядома змагацца супроць гэтага корня рэлігii, супроць панаваньня капіталізму ва ўсіх формах.

ЛЕНІН.

Загадкі.

1. Што стаіць у сярэдзіне Волгі?
2. Дзе варэньне саладзей за ўсё?
3. Якія зубы ня кусаюцца?
4. Што будзе заўтра, а было ўчора?
5. Ляцела дзесяць гусей, аднаго застрэлілі. Колькі засталося?
6. Адзін дзед, два бацькі, два сыны, адзін унук, колькі ўсіх?
7. У якім годзе людзі елі больш звычайнага?
8. Які ланцуг ніхто ня можа падняць?
9. Сын майго бацькі, а мне ня брат. Хто гэта такі?
10. Што ў СССР стаіць на самым апошнім месцы, ва Францыі—на другім, у Аўстрыі—на пятым, а ў Румыніі—на першым?

Адгадкі: 1. Літара „л" 2. На языку. 3. Зубы грэбеня. 4. Сёньня. 5. Застаўся адзін застрэлены. 6. Трое 7. У высакосным. 8. Георкы ланцуг. 9. Я сам. 10. Літара „р".

Усяго толькі і пасьпела Сьцепаніда, што два разы перахрысьцілася і разам з нарадам дахаты пачыкільгала.

Уважла ў хату, перахрысьцілася:

— Бог міласьці прыслаў... А малако прападзіла?

— Прападзіла.

Глянула бабка на жбанкі, глянула на сьцены—так і ахнула.

— Тэкля, бясстрамныя бельмы твае!.. Чаму гэта ты сьвятымі абразамі жбанкі панакрывала!?

— А чаго-ж ім бяз дзела стаяць?

Сьцепаніда чуць у вобмарак ня кінулася.

— Пакарае цябе бог, ой пакарае, унучка!

— Хай карае.

— Хай?.. Эх, Тэклячка, Тэклячка!..

Зьдзьмухнула бабка пыл з Міколы-ўгодніка, сьцерла малако з вуснаў Спаса і кожнага паставіла на сваё месца.

Сьцепаніда моліцца, Сьцепаніда хрысьціцца, а Тэклячка надрываецца са сьмеху.

Памоліцца бабка, на абразы гляне.

— Злуюць?—Эхне і сама сабе адкажа:

— Злуюць... І зноў давай маліцца.

Ад паклонаў сьпіна ные, ад крыжоў рукі ломіць, ад малітваў губы не расчыніш.

Малое зярнятка яблыннае, да вялікае дрэва вырастае з яго. Закінула Тэклячка ў душу бабкі сумненьня зярнятка, невялічкае яно, з макавінку.

Пусьціла зярнятка расточак, з расточка галінку, і вырасла раздум'ем:

— Ці дарма нясу маліцьвенныя мукі?

Гоніць бабка думкі спаскусныя з галавы, а думкі, як муха асеньняя, навойлівая, жужаць і жужаць:

— А можа і праўду Тэклячка гаворыць?

Зьбілася бабка са шляху, пракладзенага векамі верай, і ў такі буралом заблудзілася. Усё стараецца думку зьвярнуць на „бог ёсьць", а ўпапярок шляху становіцца „бога няма".

Лёгкае слова, з вуснаў выпушчанае, цяжкае, калі думамі ў галаве ляжыць.

Думала, думала бабка, па ўсіх сьвятых розумам раскідалася і да таго дадумалася, што жыцьцю сваiму ня рада стала.

Урэшце, дадумалася:

— Дай-жа разузнаю, ёсьць бог ці няма.

Выбрала хвілінку, калі Тэклячка з хаты выйшла, памалілася, ды як харкане ў твар Спаса.

Харканула, ад страху на падлогу села,— ногі аднялiся; сядзіць, вочы рукою зачыніла,— чакае вось-вось стукне гром і пакарае яе.

Чула яна, ды ня раз,—і у царкве ў навучаньнях, чула і ад людзей граматных чытанку, як губіць бог ярэцікаў агнём нябесным.

Няхай загіне і яна, ужо лепш мука-пакутная ў аду, чым гора на зямлі.

Прыслухоўваецца бабка да грому і нічога ня чуе. Толькі чуе, як у коміне вецер пашальвае. Глядзіць з пад рукі на маланку—і ня бачыць яе, толькі сонца зайчыкам уклалася на падлозе.

Пачакала, бабка, пачакала, падняласе з падлогі, на Спаса глянуць асьмелілася: па твары Спаса яшчэ плявок расплываецца.

Упілася яна пальцамі ў валасы і зарыдала:

— Што-ж я, праклятая, нарабіла!

Выцерла Спасу лік, кінулася на калені, і давай паклоны адбіваць.

Жэрыць паклон за паклонам, а ў галаве сьвідруе:

— Каб бог быў, няўжо-б сьцярпеў ён!..

І зноў бабка бога за рогі.

Зьняла Сьцепаніда Спаса з бажніцы, нож з пад скацерці дастала... і у Спаса замест вачэй—белыя плямы.

Ну, думае бабка, цяпер ня сьцерпіць, запратэстуе...

Нічога ня чутно. Пасьмялела Сьцепаніда:

— Унь што!

Ды саскрэбла з дошкі ўсяго бога, а потым і за другіх узялася.

Уважла Тэклячка ў хату, агледнулася,—ці не да чужых папала: голыя сьцены, на стале касьцёр дошак.

— Бабка!..

Сабрала Сьцепаніда дошкі ды пад печак заправадзіла.

— Цяпер і я, Тэклячка, бязбожніца!

Міх. Воўкаў.


Панаваму.

Пажаніліі ў „Загсе" Янку
І Марылю без папа,
І назаўтра Янку зранку
Лаяў бацька ля тарпа:

„Ты ня слухаў, сынку, тагы,
Збрыдзіў старага, як хам,
Выбірайся з мае хаты,
Я нічога вам ня дам.

Кай у сэрцы лопнуць жылы,
Бо ы мз маткай бралі шлюб,
У папілы, у Вавілы,
Дзяк сьпяваў нам у дванцаць губ!

А цяпер, як каля плоту,
Проста брыдка і глядзеш



Нешта скажа абармоту
І у клець ужо вядзець».

Янка слухаў—не злаваўся,
Хоць круціў варпеў папом,
Бо ў чырвоных ён спазнаўся
І з законам і з пяром.

Не палез ён з бацькам біцца,
Ня пусьціў у ход кулак—
Не хацеў сараміцца,
А зрабіў ён, чуйце як:

Узяў паперу. Шасьць — заява
У два-тры словы і капут:
„Абарону свайго права
Аддаю ў Народны Суд".

Цераз месяц—два—гатова:
Суд дзяліў іх папалам:
Бык—табе,—яму карова,
Тут япрук, цялуха там.

Бяз крыві, без пагалоскі:
Ты сюды, а ты туды...
Эх, каб гэтак усе вёскі
Без разбою, бяз брыды

А. ДЗЯРКАЧ,

Песьні на калядных вячорках.

Поп і чорт

(На мотыў «Буря мглою небо кроет».

У царкве неяксьці пад сьвята,
Перад люднай грамадой
Меў звычайную размову
Поп у рызе залатой.

Босы, голы і галодны
Быў і Янка і Патрук,
Ў гузаках былі іх рукі—
Поп быў гладкі, як япрук.

— «Братцы!» ён хлусіў народу:
«Вы правіціцесь панам,
Наракаеце на бога.
Што жывецца кепска вам.

Памятайце, што за гэта,
Як надыйзе страшны суд,
Ў пекла самае пацягнуць
Чэрці вас дзеля пакут.

Будуць вас пароць ражнамі,
Перыць цэпам ці калом,
Або скуру драць крукамі
І ў смале варыць жыўцом:

Трэба кінуць паняверку
І пагарду сваю збыць,
Калі хочаце ня пекла,
Але раю заслужыць».

Каля царквы, як-бы цудам,
Чорт праходзіў ў гэты час
І пачуў папову мову
На сярэдзіне якраз.

З паўгадзіны, а мо' й болей
Пад ваконцам ён стаяў
І ўсе паповы словы
На хвасьце сваім зматаў.

Павалілі з царквы людзі,
Ім усьлед выходзіць поп.
Чорт, як воўк, блiснуў вачыма
І папа за грыву—цоп!

„Стой, папіла тоўстапузы!
Што пра нас ты ў царкве лгаў?
І якія гэта штукі
Ты пра пекла маляваў?

Чортам ты хацеў спалохаць,
Або пеклам—вось дурны,
Што ім гэта, калі пекла
У жыцьці царпяць яны".

Поп у лукаткі зьбіраўся
Лататы ад чорта даць.
Але той, як смоўж, дзяржаўся,
І папу—ні даць, ні ўзяць;

Падганяючы каленам,
Чорт завёў яго ў завод,
Дзе нявольнік капіталу
Ў цяжкай працы ліў свой пот.

У папа аж дух заперла!
Носам чмыхае, як конь,
А вакол грымяць калёсы
І у твар пячэ агонь.

І куды ні глянеш вокам—
Дым і чад стаіць кругом:
Сталь шыпіць, лятаюць іскры
І гудзе, гудзе, як гром!

Поп пачаў ужо прасіцца:
— Адпусьці мяне, чарток!
— Пачакай—яшчэ да пекла
Я цябе не давалок!

І, за карк яго схапіўшы,
Крукам чорт у неба змыў
І ў новую майстэрню
Таўстапузага спусьціў.

Тут было ўжо горш, як ў пекле:
У катле кіпеў чыгун,
Печы зьзялі, як маланка,
І у бубен біў пярун.

Раптам стала языкамі
Уверх кідаць чыгунны вар...
Уцячы хацелі людзі,
Рукавом закрыўшы твар.

Але ўжо ня мелі рады
Сьмерць іх тут падсьцерагла,
І згарэўшыя ляжалі,
Як снапы, каля катла!

Бязбожныя прыпеўкі.

Мне бацькі усё гавораць:
— «Маліся богу, асталоп»;
А я ім даю адповедзь—
Няма бога й ня было.

Нядзелечка падыйшла,
Не пашоў маліцца,—
Часы тыя ўжо прайшлі,
А пайду вучыцца.

Ніж на бога упаваньне
На сабе лепш наракай:
Не падгадзіш, справу зладзіш—
Зажыве Савецкі край!

Папы—клапы,
Брухачы—ілгалі,
Радзі масла, палатна—
Бога выдумлялі.

Ванька з Піцеру прыехаў,
Навін уйму нам прывёз:
Сквэрлі Неўскага сьвятога,
Папы румалі бяз сьлёз.

Цім, цілім, мае цымбалы,
Весяліся, малойчыкі!
Завялі між сабой шалы
Сьвятыя угоднічкі.

Ад страхою месяц белы,
Чытальні карагод.
Дзяк па вёсцы нешта бегаў,
Сядзеў коса на народ.

Звон галосіць—ой-ё-ёй,
Аж дрыжыць званіца:
Апусьцелі царквы ўсе—
Дурных няма маліцца.

На каляды дзед Мікола
Не пайшоў богу маліцца;
Заявіў усім у школе—
Хачу грамаце вучыцца.

У суседа у Данілы
Занядужала кабыла.
Прышоў поп з сваім кадзілам—
Просіць сілы для кабылы.

Яраплан ў гары бурчыць,
Як віхура ў лесе.
Дзяк убачыў і крычыць—
Ой, хрыстос васкрэсе!

То ня Юр'я ў полі ходзіць,
Землю адмыкае;
На шматпольле сельсавет
Поле разьбівае.

Ходзіць—бродзіць поп вясковы,
Патрасае грывай,—
Ня дуры ты нам галовы,
Бо патурым жыва!

Не званеце больш званы,—
Я ўжо хлопец ня дурны:
У рай нябесны не хачу я,—
Тут мы лепшы пабудуем.



ГАСПОДЗЬ ПАЦЯШАЕЦЦА ДУХОЎНЫМ ПЕНЬНЕМ „ПАЦЯГНІ КАЗУ ЗА ХВОСТ".

Савецкі шлюб.

Нам у папох няма патрэбы,
І бяз іх ідуць дзяла:
Без падарачкаў запішуць
У сельсавеце ля стала.

Мой міленак мяне сватаў,
За яго замуж пайду,
Мы запішамся ў савеце,
А к папу я не пайду.

Бацька любіць пакрычаць,
Каб мяне ў царкве вянчаць,
А я хатнім у адказ—
Няма дурняў на паказ!

Эх, ты мілка—макаў цьвет,
Чаго харахорышся?
Дай мне ручку, ды ў савет—
Тама успакоішся.

Гэта божыя цымбалы
І Ісусава гульня—
Прасьвятая мацер божа
Скакаць ў прысядкі пайшла.

Эх, ты, яблычак, каціся,
Бо дарога сьлізкая.
Надкузьміла усіх сьвятых,
Гульня комсамольская.

Стары бог, як паглядзеў,
Што за перамена—
Ў трое сутак палысеў,
Быццам-бы палена.

Для мяне капалі яму,
Амінь сьпявалі папусту.
Не вазьму Куліну замуж—
Пакланяецца Хрысту.

Чырвонаармейскія

Матка Ціта выпраўляла,
Крыж на шыю надзявала;
У слаўнай арміі, у роце,
Ціт павесіў крыж на плоце,

Раней біў фядфэбель у зубы,—
Нам такой ня знаць пары.
Мы з камротам ходзім ў клюбы,
Там праводзім вечары.

Усе сьвятыя загулялі,
Мабыць бог у адпуску.
Папы многа нам блялі,
Усё напрасна, папусту.

Народныя пагаворкі

Вазі гной, не ляніся, дык і богу не маліся.
Пост—ня мост: аб'ехаць можна.
У папоўскую кішэню з галавою схаваешся.
Мужык толькі піва заварыў, а поп ужо з вядром.
Адна радасьць папу: што вясельле, што хаўтуры.
На бедняка і кадзіла чадзіць.
Бязьмен—не папоўска душа, не абмане.
Поп хоча вялікага прыходу, а сам чакае, калі хто памрэ.
Праведна жыве: з беднага бярэ ды на царкву кладзе.
Дзе гноем сьмярдзіць—там і родзіць.
Дзе араты плача—там жняя скача.
Горка рэдзька—ды ядуць, кепска замужам—ды йдуць.
Да Пятра—з макатра. На Пятры—у макатры.
Да Юр'я павінна быць сена і ў дурня.
Доўг не раве, але і спаць не дае.
Каб ня клін, ды ня мох—даўно-б майстра здох.
Каб ня зáрка ў роце—хадзіў-бы ў злоце.

Фото-вакно „Чырвонай Зьмены".



На здымку—дзеці на занятках у татарскай школе ў Казані.



У Вятцы адчынены працоўны дом для падлеткаў—праванарушыцеляў. На здымку—выхаванцы дому за працай.



Занятkі па хэміі ў Прамыслова-Эканомічным тэхнікуме ў Тыфлісе (Грузія).

Гармонік у пашане.

На конкурсе гарманістых-чырвонаармейцаў менскага гарнізону.

...Як на жаль у наўцёмнай залі Дому Чырвонай Арміі сядзелі і слухалі непазабыўную музыку 25-ці гарманістых толькі карэспандэнты і чырвонаармейцы. А слухаць было што... Я цяпер праз дзень ніяк не магу сабе адказаць, чым мяне прывабілі гэтыя сапраўды нікчэмныя полькі і вальсы—«Страданне» і «Оборваные струны», якім чынам я апынуўся ў іхнім палоне і адчуў гэтую гарачую радасьць, для якой я ня маю вызначэньня, для якой, мабыць, і няма эпітэтаў на людзкой мове.

Калі я разьбіраўся ў выкананьні гэтых вальсаў і полек, я знаходзіў у іх шмат недахопаў, яны былі абрывучаты і рэзкі, у іх ня было чагосьці дасканальнага і ўпэўненага, што ёсьць ў выканаўцаў «большой руки».

І ўсё ж такі ў гэтай музыцы ёсьць свая выглядная прыгожасьць.

Рэпертуар усіх выканаўцаў быў прыблізна аднолькавы, вальсы зьмяняліся полькамі, полькі маршамі, маршы мазуркамі і г. д.

Музычнае выкананьне вытрыманае і добрае было ў **Гаргушына** (40 полк). Яго мазурка Вяняўскага, марш Будзёнага і вальс «На палях Галіцыі» гучэлі вельмі добра і па новаму. А маршы **Курсакова** (6 полк) унесьлі ў залю моцную чырвонаармейскую бадзёрасьць, далі адчуць упэўнены поступ ідучых палкоў.

Сапраўдныя дасягненьні музыкальнае, добрае выкананьне паказаў **Янін** (загадчык клюбаш конардыву). Яго Шаміль, Маршок, яўрэйскае—7,40, вальсы, мазуркі былі чоткі і грандыёзны. Яны, паказалі на што здольны гармонік.

Астатнія выступаўшыя былі слабымі.

Увесь конкурс наогул агромністы, сыры матар'ял. Але сярод іх бліщчэлі і таленавітыя адзінкі.

А. К.

Да ведама піонэраў і вучняў.

У пятніцу 30-га сьнежня а 6-ай гадзіне ўвечары адбудзецца вечар, прысьвечаны юбілею „Беларускага Піонэра".

Апрача невялічкай урачыстай часткі, на вечары будуць выступленьні піонэраў і вучняў з дэкламацыяй, песьнямі, пасьля—кіно.

Вечар адбудзецца ў клюбе працаўнікоў асьветы (Комуністычная, 19).

Білеты разасланы ў райкомы ЛКСМБ (райбюро Ю. П.), дзе і належыць атрымаць для школ і атрадаў Ю. П.

Рэд. «Бел. Піонэр». Акругов. бюро ЮП.

Авіяхімаўцы на дапрызыўных пунктах.

Цэнтральны савет беларускага ТСА-Авіяхіму даў паказаньне аб удзеле ячэек таварыства ў правядзеньні дапрызыўнай падрыхтоўкі моладзі 1906 году нараджэньня.

Ячэйкі ТСА-Авіяхіму праводзяць на дапрызыўных пунктах сыстэматычную працу па ўцягненьні дапрызыўнікоў у сябры таварыства. Абсталёўваюцца вайсковыя куткі. Арганізуюцца спэцыяльныя справачныя аддзелы ТСА-Авіяхіму.

Разам з ячэйкамі ТСА-Авіяхіму на дапрызыўных пунктах праводзіцца падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Чырвонай арміі.

У лютым 1928 году будуць склікаца раённыя конфэрэнцыі перамяньнікаў сумесна з ТСА-Авіяхімам.

Шахматна-шашачныя навіны.

Ля шахматнай дошкі.

(Клюб менскіх маладых шахматыстых).

Пачын паклалі менскія вучні-шахматысты. Зацікаўленасьць шахматамі ў школах асабліва расьці асабліва ў 1925 годзе, пасьля міжнароднага шахматнага турніру, які адбываўся ў Маскве ў канцы 1925 году.

Па школах стыхійна былі праведзены турніры вучняў, пасьля правялі агульна-школьны турнір, а ўдзельнікі апошняга выказалі ініцыятыву аб арганізацыі вучнёўскага шахматнага клюбу.

У пачатку 1926 г. такі клюб арганізаваўся. Спачатку будучы толькі цэнтрам шахматыстых-вучняў сямігодак, ён непрыкметна аб'яднаў студэнтаў тэхнікумаў і ВНУ, а ў 1927 годзе стаў цэнтрам усёй шахматнай думкі менскай моладзі.

Афіцыйна ён і цяпер—клюб пры шахсэкцыі ЦБ Пролетстуду, на справе-ж ён яднае ўсю рабочую моладзь, і маладых служачых і вучняў.

Клюб шмат чаго дасягнуў у адносінах арганізацыі шахматыстых, кіраўніцтва асобнымі гурткамі, практычнай дапамогі маладым шахматыстым.

Вечарам, тры разы ў тыдзень працуе ён. У цэнтры працы—аматарскія гульні. Тлумачэньне зробленых хадоў, разбор згуляных партый—вось практычная дапамога сябром клюбу. А яднае клюб каля 80 чалавек.

Зараз заканчваецца турнір на першынство клюбу. У турнір пераможцаў вышла 18 чалавек. Сярод іх рабочыя-комсамольцы—Кобац, Жігэровіч і Левін. Наперадзе—Лівкінд і Мазэль. Яны пэўна і выйдуць на першае і другое месцы.

Адзначым аднак, што ёсьць і дрэнныя бакі ў працы клюбу. Калі клюб дае яго сябрам шмат з практычнага боку, дык за гэтых пор не наладжана тэорытычная вучоба. Вось, напрыклад, арганізоўваецца сэкцыя шахматных композытараў (складальнікаў шахматных задач і эцюдаў), але да гэтага часу яшчэ невядома ці падшукалі кіраўніка, што наогул гэты гурток будзе рабіць.

Няма гуртка для новых шахматыстых. Уся праца клюбу покуль што ішла ў аматарскіх партыях і турнірах.

Гэта ня кепска, але клюбу на далейшы час **трэба зьвярнуць увагу на тое, каб яго сябры атрымлівалі і тэорытычную дапамогу на сваім шахматным шляху.**

Нін. А.




Таварышы!

1-га студзеня заканчваецца конкурс па складаньню і рашэньню шахматных і шашачных эцюдаў. Рашэньні будуць прымацца да 31 сьнежня. Вынікі конкурсу будуць абвешчаны пасьля 15 студзеня.

Шахматы і шашкі

Задача № 19

Кобац—Мазэль.



Белыя: Кр a2, Фh1, Лa4, Лd8, Кc4, Кe4, пп: b5, c3, f5, g4... (10)
Чорныя: Кр d5, Фd6, Кd7, Сb7, Сf4, пп: a3, b6, d3, e3, f6... (10)

Мат у 2 хады

Эцюд № 11 (шашачны)

Левіна. (Барысаў)

Белыя: D—c1, h2, пп: e1, d2, h4.. (5)
Чорныя: D—f6, c5, пп: b6, a5.. (4)

Белыя выйгрываюць.

Галоўлітбел № 24867.

Адказныя рэдактары: (А. Баранькінаў (А. Курцін

1-ая дзяржаўная друкарня.